# Родныя людзі

## Старшыню галоўнага праўлення Беларускага грамадска-культурнага таварыства ў Польшчы Яна Сычэўскага з юбілеем павіншаваў прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка

**Іван Іванаў**

Ян Сычэўскі просіць не гаварыць і не пісаць: "беларуская дыяспара ў Польшчы". А тым больш: "этнічная меншасць". Бо, удакладняе, беларусы ў зямлю Беласточчыны даўно і моцна ўраслі родавымі каранямі, і здаўна былі там гаспадарамі. "Якая ж мы дыяспара ці меншасць, калі нашы продкі-беларусы жылі на Беласточчыне спрадвеку?" — помніцца, аргументаваў сваю пазіцыю Ян Янавіч на першым пасяджэнні Кансультатыўнага савета кіраўнікоў грамадскіх арганізацый суайчыннікаў, якія пражываюць за мяжой. Праходзіла пасяджэнне ўрачыста, у будынку Нацыянальнай бібліятэкі. І размова пра справы беларусаў замежжа ішла глыбокая, на высокім дзяржаўным узроўні. Ян Янавіч ахвотна дзяліўся досведам працы Беларускага грамадска-культурнага таварыства ў Польшчы, галоўнае праўленне якога ён доўгі час узначальвае. У прыватнасці, шырокі розгалас мае Агульнапольскі фэст "Беларуская песня". Год таму падрабязна пра справы беларусаў Польшчы расказвала і наша газета — як вуснамі самога Яна Сычэўскага ў тэксце "Прыгожым спевам поўніцца душа", так і Валерыя Шмата, кіраўніка гурта "Беларусы", які хораша выступаў на мінулагоднім фэсце ў Беластоку.

Ян Сычэўскі быў сярод дэлегатаў з замежжа на IV Усебеларускім народным сходзе, ганаровым госцем на Першым фестывалі мастацтваў беларусаў свету.... → Стар. 2



Ян Сычэўскі — беларус з Польшчы

# Родныя людзі

(Заканчэнне. Пачатак на стар. 1)

Зрэшты, гэта толькі бачны бок вялікай грамадскай працы, скіраванай на развіццё беларускай культуры, якой не адзін дзясятак гадоў аддае сілы і веды добра вядомы і ў Беларусі, і за яе межамі юбіляр. “Ваша імкненне быць беларусам і за межамі сваёй Айчыны заслугоўвае самай глыбокай павагі. Перакананы, што вашы намаганні і ў далейшым будуць накіраваны на высакародныя мэты, — адзначыў у сваім віншаванні Прэзідэнт. — Рэспубліка Беларусь зробіць усё, каб беларусы замежжа адчувалі любоў і падтрымку Радзімы”. Аляксандр Лукашэнка пажадаў юбіляру здароўя і энергіі, аптымізму і дабрабыту, поспехаў ва ўсіх справах.

Варта нагадаць, што Ян Сычэўскі родам з вёскі Стрыкі Бельска-Падляшскага павета Беластоцкага ваяводства. Педагог па адукацыі: у 1955 годзе закончыў Педагагічны ліцэй у Бельску-Падляшскім, а пазней і педфакультэт Гданьскага ўніверсітэта. Доўгі час працаваў выкладчыкам ў Беластоцкім політэхнічным інстытуце, дзе вёў заняткі па псіхалогіі і сацыялогіі працы, педадукацыі студэнтаў і маладых супрацоўнікаў інстытута. Ён аўтар шэрагу навуковых прац у галіне педагогікі ВНУ. Ян Янавіч плённа займаецца грамадска-культурнай дзейнасцю, неаднаразова выбіраўся на кіруючыя пасады ў Беларускім грамадска-культурным таварыстве, галоўнае праўленне якога ўзначальвае. Быў дэпутатам сейма Рэчы Паспалітай III склікання, узнагаро-джаны многімі польскімі адзнакамі, а таксама медалём Францыска Скарыны Рэспублікі Беларусь.